# СТАНАЎЛЕННЕ ДЫЯЛОГА Ў ДАШКОЛЬНЫМ ЎЗРОСЦЕ

Н.С.Старжинская, Д.Н.Дубинина

Дзіця авалодвае дыялагічнай формай камунікацыі ў працэсе зносін. На працягу дашкольнага дзяцінства камунікацыя ажыццяўляецца адносна дыялогу – дарослы–дзіця і дыялогу – дзіця–дзіця. Развіццё камунікатыўных здольнасцей дзіцяці пачынаецца ў дыялозе дарослы-дзіця. Н.І. Лепская вызначае такія аспекты гэтага дыялогу, як прадметна-змястоўны, эмацыянальны і фатычны. Пры гэтым яна падкрэслівае, што на працягу дашкольнага дзяцінства месца гэтых аспектаў ў развіцці дыялогу змяняецца. На ранніх стадыях маўленчага развіцця дзіцяці перавагаюць эмацыянальны і фатычны аспекты дыялогу. У далейшым, паступова, на першы план выходзіць прадметна-змястоўны аспект дыялогу, а эмацыянальны і фатычны аспекты выступаюць у ролі суправаджаючых. С.Н. Цэйтлін да названых аспектаў дыялогу дадае дыдактычны аспект камунікацыі. Асноўнае прызначэнне гэтага аспекту яна бачыць у тым, што ў дыялозе з дзіцём дарослы вучыць малога, знаёміць з навакольным светам. Пры гэтым даследчыца падкрэслівае, што дыдактычны аспект дыялогу ўключае не толькі навучанне малога роднай мове, але і авалодванне дзіцём правіламі камунікацыі з выкарыстаннем роднай мовы. (лінгвадыдактычны аспект дыялогу).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Неабходна адзначыць, што навучанне малога мове і авалодванне правіламі камунікацыі ажыццяўляецца ў некалькіх накірунках. Па-першае, гэта кагнітыўны накірунак – пашыраюцца ўяўленні дзіцяці пра навакольны свет. Па-другое, камунікатыўны накірунак – дзіця вучыцца быць партнёрам ў дыялозе. І, па-трэцяе, моўны накірунак – валоданне моўнымі адзінкамі і правіламі іх слушнага выкарыстання. У рэальнай камунікацыі ўсе чатыры аспекты камунікацыі (прадметна-змястоўны, эмацыянальны, фатычны, дыдактычны) сумяшчаюцца, накладваюцца адзін на другі, хаця ў кожным асобным выпадку які-небудзь з іх

аказваецца перавагаючым. Пры гэтым дыдактычная функцыя прысутнічае ў той ці іншай ступені ў кожным камунікатыўным акце.

Для пачатковага этапу развіцця камунікацыі дарослага і дзіцяці, па меркаванні Т.В. Базжынай, характэрны эмацыянальна-прадметныя дыялогі. У 5 месяцаў дзіця даступнымі яму сродкамі (гуленнем, лепетам) стараецца прыцягнуць да сябе ўвагу дарослага. Малое выражае свой эмацыянальны стан, а дарослы ў адказваемых рэпліках прыцягвае ўвагу дзіцяці да прадметаў і з'яў навакольнага асяроддзя. На першым годзе жыцця, у зносінах паміж дарослым і дзіцём, маці выкарыстоўвае вялікую колькасць пытанняў, частата выкарыстання якіх зніжаецца па меры сталення дзіцяці. Пры гэтым, пытанне выступае як галоўны і адзіны маўленчы акт, які патрабуе абавязковай вербальнай рэакцыі. У даследаванні Т.В. Кузьміной падлічана, што ў маўленні маці да дзіцяці ва ўзросце да двух гадоў пытанні складаюць да 60 %. Пры гэтым толькі нязначная частка гэтых пытанняў з'яўляецца сапраўднымі запытаннямі аб інфармацыі, якою маці не валодае. У дыялозе дарослы–дзіця часта выкарыстоўваюцца рэплікі–пытанні, якія патрабуюць ад дзіцяці невербальнага дзеяння: *як машынка ездзіць, як сабачка размаўляе.* З дапамогай пытанняў дарослага дзіця атрымлівае магчымасць удзельнічаць у дыялогу, хаця і не валодае яшчэ ў дастатковай ступені вербальнымі сродкамі. У якасці актыўных рэплік выступаюць гукаперайманні ці пэўныя дзеянні дзіцяці.

У два гады маўленне малога дзіцяці становіцца асноўным сродкам зносін з блізкімі дарослымі. Узнікаюць дыялогі, якія Т.В. Базжына, Н.І. Лепская называюць прадметна-дзейнаснымі. Дарослы славесна абазначае дзеянні, якія павінны выконвацца ім ці дзіцём. Потым паяўляюцца "сумесныя тэксты", якія характарызуюцца тым, што дарослы і дзіця разам устанаўліваюць залежнасць паміж элементамі сітуацыі. "Сумесныя тэксты" падрыхтоўваюць глебу для

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

“дыктальных дыялогаў”, якія будуюцца па пытальна-адказнай схеме; пры гэтым славесна абазначаны ўсе элементы сітуацыі.

Такім чынам, першапачатковай недыферэнцыраванай формай зносін маці і дзіцяці з’яўляецца “дуэт” (Н.І. Лепская) – асобая з’ява нескардынаванага маўленчага ўзаемадзеяння, у якім праяўляюцца рысы і дыялога, і маналога. Якасць скардынаванасці дыялога на пачатковых этапах забяспечваецца маці, якая будуе дыялог, запаўняе паузы, падказвае дзіцяці магчымыя варыянты падтрымання і развіцця тэмы.

У раннім узросце зносіны дзіцяці з дарослым грунтуюцца на тым, што ў пэўны момант бачаць абодва суразмоўніка, пры гэтым маўленне дзіцяці і дарослага характарызуецца няпоўнымі сказамі, яно выражае адносіны, таму ў ім шмат выгукаў (займеннікаў), што да найменняў прадметаў, то яны, часцей за ўсё, замяняюцца асабовымі і ўказальнымі займеннікамі. Агульнасць непасрэднай сітуацыі накладвае адбітак на характар маўлення і не патрабуе ад дзяцей неабходнасці называць тое, што яны бачаць.

◄*Што ўяўляе сабой сітуацыйнае дыялагічнае маўленне?*

Маленькае дзіця авалодвае перш за ўсе маўленнем, якое тычыцца непасрэдна ўбачанага. Такое маўленне, якое не адлюстроўвае цалкам зместу думкі ў маўленчых формах, даследчыкі назвалі сітуацыйным маўленнем. Змест сітуацыйнага маўлення становіцца зразумелым для суразмоўніка толькі ў тым выпадку, калі ён улічвае сітуацыю, умовы, у якіх расказвае дзіця, яго жэсты, рухі, міміку, інтанацыю. Сітуацыйнасць дзіцячага маўлення праяўляецца ў вельмі частым выкарыстанні займеннікаў трэцяй асобы і выразаў тыпу *там, тады, такі.* У маўленні маленькага дзіцяці перавагаюць жэсты, міміка, якія істотным чынам перадаюць сказанае словамі. Калі не бачыць дзіця ў момант маўлення, ці не ведаць ў дакладнасці ўсю сітуацыю, можна проста не зразумець, што яно мае на ўвазе. Кантэкстам для маленькага дзіцяці з’яўляецца сітуацыя, якая ці мае месца

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ў час размовы, ці добра вядома дарасламу. С.Л. Рубінштэйн ілюструе дадзеную думку наступным прыкладам:

Апавяданне дзяўчынкі Галі, 3,4 гады ( Рубінштэйн, 1946).

“ Там было на вуліцы далёка сцяг. Там была вада. Там мокра. Мы ішлі там з мамай. Яны хацелі ісці дамоў, а дожджык капае. Таму, што ён хоча есці, госці”.

Расшыфроўка сітуацыі: дзяўчынка Галя з маці і яе маленькім брацікам ( ён на руках у маці) хадзілі глядзець на дэманстрацыю. Пайшоў додж, было сыра, маці ўгаварыла Галю вярнуцца, таму што дома іх чакалі госці, а маленькае дзіця хацела есці”

◄ *Які характар носіць дыялагічнае маўленне ў раннім ўзросце?*

Як ужо адзначалася, у раннім дзяцінстве маўленне дзіцяці непасрэдна звязана з яго практычнай дзейнасцю ці сітуацыяй, у якой, ці з нагоды якой адбываюцца зносіны. Дзейнасць дзіцяці гэтага ўзросту здзяйсняецца ў большасці выпадкаў ці сумесна з дарослымі ці з іх дапамогай.Таму і яго зносіны носяць сітуацыйна-дыялагічны характар. Маўленне дзіцяці, як адзначае Д.Б. Эльконін, уяўляе сабой: ці адказы на пытанні дарослага, ці пытанні да дарослых у сувязі з перашкодамі, якія ўзнікаюць у ходзе дзейнасці, ці патрабаванне аб задавальненні тых ці іншых патрэб, ці пытанні, якія ўзнікаюць пры знаёмстве з прадметамі і з’явамі навакольнай рэчаіснасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Да двух с паловай гадоў ў працэсе камунікацыі з дарослым дзіця адчувае дэфіцыт вербальных сродкаў, што праяўляецца ў недастатковым аб’еме лексікона. У гэты час малыя актыўна засвайваюць парадыгматыку асноўных частак маўлення, а таксама законы пабудовы сказаў і словаспалучэнняў. Фанетычнае афармленне выказвання ў многіх дзяцей вызначаецца недасканаласцю, мае наяўнасць складовая элізія, субстытуцыя гукаў, метатэзіс,

асіміляцыя, што перашкаджае разуменню іх маўлення дарослымі. У цэлым гэты перыяд лічыцца асноўным у засваенні дзіцем роднай мовы.

Дыялогі з маленькімі дзецьмі, якія ініцыіруюцца дарослымі змяшчаюць аднатыповыя рады дыялагічных адзінстваў, *напрыклад, дзе ў мішкі вочкі.* Структурныя кампазіцыі адпрацоўваюцца на працягу доўгатэрміновага часу, што дазваляе дзіцяці засвоіць сінтаксічную мадэль і значную колькасць лексем аб'яднаных у тэматычныя групы.

Засваенне навыкаў удзелу ў дыялозе з'яўляецца значнай вехай у працэсе набыцця дзіцём камунікатыўнай кампетэнцыі. Паступова ў дзіцяці паяўляецца патрэба арганізаваць дыялог самастойна. У тры гады маўленне становіцца сродкам зносін паміж аднагодкамі. Дзіця пачынае выступаць у ролі аднаго ўдзельніка зносін, потым – у ролі другога. Т.В. Базжына такія дылогі называе " аутадыялогамі". Аутадыялогі падзяляюцца на дыяманалогі, для якіх характэрна адлюстраванне большасці звязаных паміж сабой тэм, і ўнутраныя маналогі, якія перарастаюць у далейшым у эгацэнтрычныя выказванні дзіцяці.Эгацэнтрычнае маўленне ў большай ступені праяўляецца ў дзяцей ранняга і малодшага дашкольнага ўзросту. Часцей яно ўзнікае ў тых выпадках, калі дзеці сутыкаюцца з неабходнасцю асэнсавання фактаў навакольнай рэчаіснасці.

Па меры развіцця дашкольніка яго адносіны з дарослымі перабудоўваюцца, яго жыццё набывае ўсё большую самастойнасць. Прадметам гутаркі дзіцяці і дарослага становіцца ўжо не толькі тое, што яны ў гэты момант бачаць і перажываюць, таму папярэднія сродкі сітуацыйнага маўлення не дапамагаюць яснасці і дакладнасці маўлення дзіцяці. Узбагачаючы свой слоўнік дзіця пачынае шырэй карыстацца найменнямі прадметаў. Яно аваллодвае ўсё больш складанай пабудовай маўлення, што дазваляе яму найбольш звязна выказваць свае думкі. Змяніўшыяся грамадскія адносіны таксама патрабуюць ад

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дзіцяці большай паўнаты і дакладнасці маўлення. У дашкольнікаў узнікае новая форма звязнага маўлення – кантэкстная . Змест маўлення раскрываецца з-за самаго кантэксту, дзякуючы чаму яно становіцца зразумелым для слухача. С узнікненнем гэтай формы маўлення ствараюцца, па меркаванні С.Л. Рубінштэйна і А.М. Лявушынай, перадумовы для навучання дзяцей звязнаму маўленню.

◄ *Ці знікае сітуацыйнае маўленне ў сувязі з паяўленнем кантэкстнага?*

З паяўленнем кантэкстнага маўлення сітуацыйнае не знікае, а працягвае існаваць не толькі ў дзяцей, але і ў дарослых. У свядомасці дзіцяці гэтыя абедзве формы маўлення паступова дыферэнцыруюцца. Яны выкарыстоўваюцца ў залежнасці ад прадметнага зместу апавядання, характару саміх зносін, абставін, індывідуальных асаблівасцей асобы малога, яго пазнавальнай актыўнасці. Абедзве формы звязнага маўлення маюць сваю афарбоўку. Сітуацыйнае маўленне адрозніваецца большай сілай экспрэсіўнасці, эмацыянальнай выразнасці. Кантэкстнае маўленне носіць больш інтэлектуалізаваны характар. Па меркаванні Д.Б. Эльконіна, не гледзячы на тое, што сітуацыйнае маўленне носіць характар размовы, а кантэкстнае маўленне – характар маналогу, нельга атаясамліваць сітуацыйнае маўленне з дыялагічным, а кантэкстнае маўленне з маналагічным, так як апошняе можа мець сітуацыйны характар.

Асобае значэнне мае паяўленне ініцыятыўнага маўлення дзіцяці, якое робіць дыялог размовай раўнапраўных партнераў па зносінах. Дыялог з аднагодкамі таксама ўзнікае ў выглядзе недамоўленай маўленчай актыўнасці дзяцей, якія знаходзяцца побач. Ж. Піажэ назваў гэтую форму “ калектыўным маналогам” і угледжваў у ёй праяўленне ўласцівага дзецям эгацэнтрызму, няздольнасці прыняць на сябе пазіцыю партнёра. Нескардынаваныя маўленчыя выказванні “калектыўныя маналогі” характэрны для ўсіх дзяцей. Асабліва часта яны ўзнікаюць ў працэсе розных відаў дзейнасці, калі дзеці знаходзяцца побач і кожны займаецца сваёй справай. Пры гэтым яны ў любы момант могуць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

наладзіць паміж сабой сацыяльны кантакт або эмацыянальную сувязь. Тут маўленне выконвае кантактаўстанаўліваючую, фатычную функцыю. Яно вызначае, падтрымлівае і забяспечвае эмацыянальны кантакт паміж суразмоўнікамі.

У дзіцяці дашкольнага ўзросту ярка выражана патрэба ва ўвазе аднагодак, жаданне давесці да ведама партнёра мэту і змест сваіх дзеянняў. У чатыры-пяць гадоў дзеці імкнуцца падзяліцца сваімі ўяўленнямі на тэмы з ўласнага вопыту, адгукаюцца на прапановы расказаць пра блізкае акружаючае іх наваколле. Менавіта ў гэтым узросце ў дашкольнікаў не хапае цярплівасці выслухаць суразмоўніка, яны ўсе пачынаюць гаварыць разам.

Як ужо адзначалася, эмацыянальныя кантакты паміж дзецьмі, іх асобасныя зносіны забяспечваюцца не толькі пры дапамозе маўлення, а перш за ўсё выкарыстаннем неславесных сродкаў – поглядаў, мімікі, жэстаў, поз, прадметных дзеянняў. Дзіця мае магчымасць дасягнуць узаемаразумення шляхам выкарыстання як вербальных, так і невербальных сродкаў.

Па меркаванні Ж.Піажэ, найбольш значным крытэрыям уласна сацыялізаванага маўлення – дыялога, з'яўляецца наяўнасць ў маўленчым узаемадзеянні не менш трох узаемазвязаных выказванняў суразмоўцаў: ініцыятыўнага выказвання, адказа на яго і рэакцыі на адказ. Пры такім узаемадзеянні кожны атрымлівае магчымасць адгукнуцца на выказванне партнёра. Гэта характарыстыка высокага ўзроўня развіцця дыялога, якога пры стыхійным навучанні дашкольнікі дасягаюць толькі на позніх ступенях развіцця.

Станаўленне дыялагічнай формы зносін праходзіць стадыю перадыялога ( " дуэта", "калектыўнага маналогу"), стадыю скардыянаваных маўленчых дзянняў, накіраваных на падтрымку сацыяльнага кантакту (фатычная гутарка), практычнага ўзаемадзеяння, паступова набліжаючыся да авалодвання " тэарэтычным", змястоўным дыялогам, асобасна афарбаванымі зносінамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Авалодванне дыялогам – больш чым авалодванне проста кампазіцыйнай формай маўлення. Гэта перш за ўсё фарміраванне дыялагічнай пазіцыі актыўных адносін да партнёра па зносінах( пытанне-адказ), уменне слухаць і разумець суразмоўцу, прыцягнуць яго ўвагу да сябе і сваёй дзейнасці, зацікавіцца суразмоўнікам і быць цікавым яму.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ